## Вынікі XXIV рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»

Патэнцыял бібліятэк у справе адраджэння нацыянальнай культуры, прапаганды яе здабыткаў, збірання і распаўсюджвання фальклорна-этнаграфічнай спадчыны ўжо каторы год выразна адлюстроўвае штогадовы прафесійны рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”, аб’яўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь у 1992 г.

13 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі былі падзведзеныя вынікі XXIV рэспубліканскага конкурсу “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры” за 2015 г.

Выявіць наватарскія ідэі, свежыя падыходы, інавацыйныя формы і метады працы было галоўнай задачай кампетэнтнага журы. У склад журы ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, абласных выканаўчых камітэтаў, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэм публічных і дзіцячых бібліятэк г. Мінска, грамадскага аб’яднання “Беларускі фонд культуры”.Чытаць далей…

У рэспубліканскім этапе конкурсу прыняла ўдзел 41 публічная бібліятэка: 15 цэнтральных бібліятэк, 26 бібліятэк-філіялаў, у тым ліку 10 дзіцячых. Пераможцы ў кожнай з намінацыяў атрымалі дыпломы першай, другой, трэцяй ступеняў і грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічыняў адпаведна.

Кампетэнтнае журы адзначыла разнастайнасць увасобленых ідэй і творчы падыход удзельнікаў конкурсу, высокую інфарматыўнасць і якасць афармлення прадстаўленых матэрыялаў, сістэматызацыю дадаткаў і культуру падачы.

Па выніках конкурсу дыпломамі першай, другой і трэцяй ступеняў былі адзначаны 23 бібліятэкі. 10 працаў было вызначана журы на заахвочвальныя прэміі, каб такім чынам, нягледзячы на нязначныя недапрацоўкі, адзначыць руплівую працу іх аўтараў. Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаныя ў адпаведнасці з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 98 ад 13 чэрвеня 2016 г. «Аб выніках XXIV рэспубліканскага конкурсу “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”».

Акцэнтуем увагу на дасягненнях бібліятэк-пераможцаў, якія атрымалі дыпломы першай, другой і трэцяй ступеняў ў кожнай з намінацый.



У намінацыі **“За пошукавую і даследчую працу”** першую прэмію сярод гарадскіх і раённых бібліятэк журы прысудзіла *Асіповіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры “Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Асіповіцкага раёна” Магілёўскай вобласці.* Бібліятэка доўгі час вядзе пошукавую працу па праекце “Імёны вайны. Дапоўнім Кнігу “Памяць”, галоўнай задачай якога з’яўляецца стварэнне базы даных па прозвішчах загінулых і прапалых без вестак воінаў. Для дадатка кнігі “Памяць. Асіповіцкі раён” супрацоўнікамі бібліятэкі сабраныя звесткі аб двухстах пяцідзесяці сямі ўраджэнцах Асіповіцкага раёна і трохсот трыццаці воінах Чырвонай арміі, якія загінулі пры абароне і вызваленні раёна. Напярэдадні 70-годдзя Перамогі стартаваў праект “Вяртаюцца да нас салдат імёны”па стварэнні віртуальнага музея, прысвечанага Вялікай Айчыннай вайне. Бібліятэка таксама выступіла ініцыятарам стварэння пошукава-даследчага краязнаўчага цэнтра “Вайна. Памяць. Пошук”, прысвечанага падзеям Вялікай Айчынай вайны.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі лепшай была адзначаная *Курынская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры “Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” Віцебскай вобласці* за рэалізацыю імідж-праекта “Фактары поспеху маёй бібліятэкі”. Актыўную даследчую і пошукавую працу па зборы інфармацыі аб гісторыі роднага краю бібліятэкар адлюстравала ў “Летапісе вёскі Курына”, які распавядае аб гісторыі сяла Курына з XVI ст. Летапіс змяшчае запісы сустрэч са старажыламі, успаміны, фотадакументы, копіі матэрыялаў з дзяржаўных і сямейных архіваў, музеяў, фондаў буйных бібліятэк. У рамках краязнаўчай праграмы “Тут карані, адсюль вытокі” пры бібліятэцы створаны этнаграфічны куток, дзе прадстаўлены старадаўнія рэчы жыхароў Курына і навакольных вёсак. Сёння этнаграфічны куток налічвае сто дваццаць чатыры экспанаты разнастайныя па змесце: рэчы гаспадарчага і хатняга ўжытку, адзенне, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – даматканыя посцілкі, вязаныя вырабы, вышытыя сурвэткі, ручнікі і г.д. У этнаграфічным кутку працуе “Майстэрня рамесніка”, дзе кожны ўдзельнік практычна можа паспрабаваць свае сілы ў тым ці іншым відзе народнай творчасці.

Другая прэмія ў намінацыі “За пошукавую і даследчую працу” прызначаная *Маларыцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры “Маларыцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” Брэсцкай вобласці* за папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны роднага горада ў межах рэалізацыі краязнаўчага праекта “Мой любы горад Маларыта” (2014 – 2015 гг.), а таксама стварэнне ўласных краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў. У рамках святкавання 450-годдзя г. Маларыта праект прадугледжваў сістэму цікавых нестандартных мерапрыемстваў, якая дапамагае маларытчанам пазнаёміцца з гісторыяй, этнаграфіяй, культурай народаў, якія жывуць у гэтым горадзе. У рамках праекта створана краязнаўчая паўнатэкставая база даных “Вялікая Айчынная вайна ў Маларыцкім раёне”, якая складаецца з 11 электронных прадуктаў, большасць з якіх можна лічыць самастойнымі базамі дадзеных.

Сярод бібліятэк, што размешчаныя ў сельскай мясцовасці, дыпломам другой ступені адзначаная *Ракцянская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры “Горацкая раённая бібліятэчная сетка” Магілёўскай вобласці*. Пошукавая краязнаўчая дзейнасць ваеннай тэматыкі – вядучы напрамак у працы бібліятэкі. Плённа ажыццяўляецца вывучэнне гісторыі населеных пунктаў Ракцянскага сельскага савета, збор звестак аб знакамітых земляках, аб удовах і працаўніках тылу, успамінаў старажылаў, а таксама збор фотаздымкаў і ксеракопій уласных дакументаў удзельнікаў і сведак ваенных падзей. Супрацоўнікамі бібліятэкі выдадзены тры зборнікі ўспамінаў жыхароў в. Рэкта і Папкоўка “Вайна вачамі аднавяскоўцаў”, “Аб чым расказаў сівы ветэран”, “У перамогі – і жаночы

твар”. Рэалізавана праграма ваенна-патрыятычнага выхавання дзяцей і падлеткаў “Нам помніць і жыць” (2014 – 2015 гг.).

Дыпломам трэцяй ступені ў намінацыі “За пошукавую і даследчую працу” ўзнагароджаная *Рэчыцкая цэнтральная раённая бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Рэчыцкага раёна,* асноўным напрамкам дзейнасці якой выступае літаратурнае краязнаўства. Бібліятэка з’яўляецца своеасаблівым салонам сустрэч з беларускімі пісьменнікамі і творчымі людзьмі, месцам, дзе праводзяцца тэматычныя і літаратурна-музычныя вечары, прэзентацыі, літаратурныя і паэтычныя гадзіны, агляды творчасці, вечары-партрэты. У выніку супрацоўніцтва з пісьменнікамі-землякамі, іх родзічамі, мясцовымі краязнаўцамі ў бібліятэцы сабрана мноства звестак, дакументаў і матэрыялаў па літаратурным краязнаўстве. Каштоўнае дапаўненне да кніжнага фонду – альбомы “Літаратурнае жыццё Рэчыцкага раёна”, якія вядуцца ў бібліятэцы з 1952 г. і ўтрымліваюць матэрыялы з перыядычных выданняў. Створана электронная база даных “Спадчына Рэчыцкага раёна”, у якой сабраны фактаграфічныя і бібліяграфічныя звесткі аб пісьменніках-земляках.

Трэцяе месца сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк заняла *Камунараўская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры “Буда-Кашалёўская цэнтральная раённая бібліятэка” Гомельскай вобласці* за грунтоўную краязнаўча-пошукавую дзейнасць. Бібліятэкай распрацаваны і рэалізуецца праект “Жыццё выдатных людзей аграгарадка Камунар”, мэта якога праз фотаздымкі, дакументальныя матэрыялы, успаміны прасачыць цікавы шлях землякоў. Краязнаўчыя даследаванні скампанаваныя ў тэматычны збор дакументаў “Мы ганарымся вамі, землякі!”, дзе занатаваныя звесткі аб шасцідзесяці трох земляках, якімі можна ганарыцца: спартсмены, вучоныя, настаўнікі, шматдзетныя маці, ветэраны вайны. Вядзецца шырокая праца па папулярызацыі творчасці пісьменнікаў і паэтаў, народных умельцаў, якія ўнеслі ўклад у духоўнае і матэрыяльнае развіццё Будакашалёўшчыны.




Дыпломам першай ступені ў намінацыі **“За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем”** узнагароджаная *Светлагорская раённая дзіцячая бібліятэка Светлагорскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Гомельскай вобласці* за паспяховую рэалізацыю 10-і праектаў па выхаванні дзяцей і моладзі: “Мадэрнізацыя дзіцячых бібліятэк. Стварэнне сучаснага інфармацыйнага асяроддзя для дзяцей і юнацтва”, “Бібліятэка і школа: партнёры ў галіне адукацыі”, “Бібліятэка + дзіцячы садок: з кнігай па дарозе дзяцінства”, “Кніжная гісторыя”, “Арганізацыя часовай працоўнай занятасці навучэнскай моладзі ў час летніх канікул”, “Бібліяпрыцемкі”, “Нескучная библиотека”, “Летняя фішка: чытай з сябрамі!”, “Рукапісная кніга”, “КНІГАманія”. Пры бібліятэцы створаныя і плённа працуюць: медыяцэнтр, Куток японскай культуры, клубы па інтарэсах “Лідар”, “Там-Тамчык”, “Літаратурынка”. Сацыяльнымі партнёрамі бібліятэкі выступаюць дзіцячыя садкі; школы; цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі дзяцей з

абмежаванымі магчымасцямі; упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва; Школа мастацтва, Дом рамёстваў; Гарадскі цэнтр культуры; тэлекампанія “Ранак”; газеты “Светлагорскія навіны” і “Ранак плюс”.

Найлепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі стала *Лабковіцкая сельская бібліятэка-музей дзяржаўнай установы культуры “Бібліятэчная сетка Крычаўскага раёна” Магілёўскай вобласці.* У рамках мэтавай праграмы “Бібліятэка-музей – цэнтр краязнаўчага асветніцтва для дзяцей” супрацоўнікамі бібліятэкі вядзецца грунтоўная пошукава-даследчая праца, праводзіцца шэраг культурна-масавых мерапрыемстваў краязнаўчай тэматыкі. Своеасаблівым брэндам бібліятэкі з’яўляюцца ўнікальныя матэрыялы аб знакамітых земляках Лабковіцкай зямлі, сабраныя па крупіцах з розных крыніц, з успамінаў сваякоў і аднавяскоўцаў. У створаным пры бібліятэцы музейным пакоі, сабрана калекцыя больш за ста экспанатаў беларускага побыту: макет печы, прылады селяніна, рэчы хатняга побыту, адзенне селяніна сярэдзіны XX ст., рэчы-сведкі Вялікай Айчыннай вайны. Асаблівую зацікаўленасць маладога пакалення выклікае калекцыя традыцыйных мужчынскіх і жаночых касцюмаў XIX ст., вырабы народнага тэкстылю (абрусы, посцілкі, рушнікі самаробнага палатна), здабытыя членамі краязнаўчага клуба “Наша спадчына” ў выніку шматлікіх краязнаўчых экспедыцый.

Другая прэмія ў гэтай намінацыі прызначаная *Касцюковіцкай раённай дзіцячай бібліятэцы імя А. Пісьмянкова дзяржаўнай установы культуры “Бібліятэчная сетка Касцюковіцкага раёна” Магілёўскай вобласці* за шматгранную працу па патрыятычным выхаванні маладога пакалення. Бібліятэкай рэалізаваны творчы праект “За датамі – імёны, за імёнамі – гісторыя”. У рамках праекта з удзелам сяброў эколага-краязнаўчага клуба “Буслянка” арганізаваная экскурсія па месцах пахаванняў воінаў і мірных жыхароў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі раёна. Былі знойдзены ўнікальныя краязнаўчыя матэрыялы ваеннага часу, якіх не было нават у краязнаўчым музеі. Праведзены дзесяткі сустрэч, апытанняў блізкіх і родных удзельнікаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, знойдзены новыя, раней не вядомыя імёны і гістарычныя факты, якія атрымалі дакументальныя пацверджанні. Усе матэрыялы перададзены ў музей для ўключэння ў дадатковы том раённай кнігі “Памяць”. Упершыню бібліятэкай для навучэнцаў школ г. Касцюковічы арганізаваная квэст-гульня “Маладое пакаленне XXI ст. памятае, ведае і шануе”, прысвечаная падзеям вайны.

Сярод бібліятэк, што размешчаныя ў сельскай мясцовасці, дыпломам другой ступені адзначаная *Псышчаўская сельская бібліятэка Іванаўскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Брэсцкай вобласці* за творчую працу па развіцці традыцый чытання і папулярызацыі кнігі сярод маладога пакалення. З мэтай прыцягнення моладзі да сістэматычнага чытання бібліятэка актыўна працуе над рэалізацыяй мерапрыемстваў праграмы па папулярызацыі кнігі і чытання сярод моладзі “Молодежь и книга: 21 век” (2015 – 2016 гг.). Былі прыдуманы і апрабаваны новыя формы работы – чытальная зала пад адкрытым небам “Бібліятэчная палянка”, інфармацыйны дэсант (правядзенне бібліятэкарам у школе экспрэс-агляда ў новых кніг у дапамогу вывучэння школьнай праграмы па розных галінах ведаў). Вялікае значэнне бібліятэка надае і героіка-патрыятычнаму выхаванню. У рамках творчага праекта “Нам та весна Победу принесла” (2014 – 2015 гг.) сярод падлеткаў быў праведзены конкурс на найлепшую працу па стварэнні электронных відэа-прэзентацый героіка-патрыятычнай накіраванасці.

Трэцяе месца ў намінацыі “За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем” прысуджанае *Пінскай гарадской дзіцячай бібліятэцы імя Якуба Коласа дзяржаўнай установы культуры “Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная*

*сістэма” Брэсцкай вобласці.* Бібліятэка вядзе дасканалую працу па вывучэнні, захаванні і папулярызацыі літаратуры, мовы, народных традыцыяў, святаў і абрадаў, творчай спадчыны класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа. Створана музейная літаратурна-краязнаўчая экспазіцыя “Якуб Колас на Піншчыне”, якая ўтрымлівае прыжыццёвыя выданні пісьменніка – 25 кніг 1948 – 1956 гг. У 2015 г. музейны куточак двойчы наведала ўнучка Якуба Коласа Вера Данілаўна Міцкевіч. На базе бібліятэкі адбыліся Першыя чытанні “Коласаўскімі шляхамі па Палессі” і Міжнародны дзень чытання паэмы “Сымон-музыка”.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк трэцяй прэміяй адзначаная *Гатаўская сельская бібліятэка-клуб Мінскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Мінскай вобласці.* Культурна-асветніцкая дзейнасць бібліятэкі накіраваная на развіццё творчых здольнасцяў дзяцей і падлеткаў, далучэнне да чытання, пашырэнне камунікатыўных сувязяў, стварэнне вольных абставінаў міжасабовых стасункаў, рэалізацыю магчымасцяў псіхічнай разгрузкі. Для дзяцей і падлеткаў бібліятэка праводзіць шэраг мерапрыемстваў, сярод якіх: сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, дні адчыненых дзвярэй, прэм’еры кніг, гумарыны, дабрачынныя акцыі, дыспуты, пазнавальна-гульнёвыя праграмы, конкурс лепшага чытача, тыдні дзіцячай кнігі, дні казак, вернісажы жывапісу і шмат іншых. Пры бібліятэцы для дзяцей і дарослых дзейнічаюць клуб арыгамі і рукадзелля “Астравок душы”, мэта якога – захаваць традыцыі рукадзелля і перадаць досвед маладому пакаленню; клуб “Давайце знаёміцца”, члены якога знаёмяцца з сучаснымі аўтарамі і дзеячамі мастацтва.




**У намінацыі “За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы”** лепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк адзначаная *Дзяржаўная ўстанова культуры “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка” Мінскай вобласці* за ўжыванне нестандартных формаў патрыятычнага выхавання, разлічаных на асаблівасці маладзёжнага ўяўлення і павышаную крытычнасць аўдыторыі. Бібліятэкай рэалізаваны інавацыйна-творчы мастацка-патрыятычны юбілейны праект “70-годдзю Перамогі – 70 патрыятычных спраў”, які стартаваў у 2014 г. Капілка важкіх справаў праекта ўключае трыццаць акцыяў і семдзесят мерапрыемстваў ваенна-патрыятычнага характару, ініцыяваных бібліятэкай і рэалізаваных у творчай садружнасці з культурнымі і адукацыйнымі ўстановамі, грамадскімі маладзёжнымі, ветэранскімі і жаночымі арганізацыямі раёна. Адаптаванымі да новага рытму часу навацыямі праекта сталі: агіт-поезд мужнасці, летні вулічны тэатр, паэтычны аўтобус, краязнаўча-патрыятычны лекторый на калёсах, экскурсійныя аўтапрабегі. Бібліятэкарамі створана Кніга ўспамінаў “Вайна маю памяць дагэтуль катуе”, якая ўключае звыш ста ўспамінаў дзяцей вайны, выгнаннікаў на прымусовыя работы ў Германію, сваякоў былых падпольшчыкаў.

Вылучылася навацыямі ў галіне бібліятэчнай справы і заняла першае месца *Бяседавіцкая бібліятэка флоры і фаўны дзяржаўнай установы культуры “Бібліятэчная сетка*

*Хоцімскага раёна" Магілёўскай вобласці.* Статус "флоры і фаўны" бібліятэка атрымала ў 2011 г. у сувязі з неабходнасцю сістэматызацыі ўзрастальнага аб'ёму экалагічнай інфармацыі і аказання насельніцтву кваліфікаванай інфармацыйнай падтрымкі. Бібліятэкай распрацаваная і вядзецца праца па праграме "Зелёная библиотека", разлічанай на 2015 – 2017 гг. У рамках праграмы створаны экалагічны web-праект "Зеленая страничка Беседовичской библиотеки флоры и фауны", які размешчаны на сайце Хоцімскай бібліятэчнай сеткі. Web-праект складаецца з шэрагу раздзелаў: ЭКА-кніжная паліца, ЭКА-прэса, ЭКА-паэзія, ЭКА-заканадаўства, ЭКА-медыятэка. Пры бібліятэцы працуе дзіцячы гурток экалагічнай накіраванасці "Расінка", аб дзейнасці якога напярэдадні 2016 г. тэлеканалам "Беларусь 4. Магілёў" быў зняты відэасюжэт. Для больш выніковай дзейнасці па экалагічнай асвеце і інфармаванні насельніцтва супрацоўнікі бібліятэкі ажыццяўляюць каардынацыю з органамі мясцовага самакіравання, раённай інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, супрацоўнічаюць з Бяседавіцкім вучэбна-педагагічным комплексам "Дзіцячы сад-сярэдняя школа".

Дыпломам другой ступені ў намінацыі "За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы" ўзнагароджаная *Баранавіцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя В. Таўлая Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Баранавічы Брэсцкай вобласці* за інавацыйную дзейнасць па папулярызацыі беларускай кнігі і чытання, распрацоўку і рэалізацыю акцыі "Беларускі дзень". Апошняя – стала самым маштабным комплексным мерапрыемствам 2015 г. Яна рэалізоўвалася з лютага па лістапад. У гэты перыяд адзін дзень кожнага месяца быў прысвечаны акцыі, у рамках якога супрацоўнікі бібліятэкі праводзілі шэраг цікавых мерапрыемстваў. Так, напрыклад, у маі сумесна са стваральнікамі інтэрнэт-праекта "Турызм і адпачынак у Баранавічах", арганізаваная акцыя, што прапаноўвала свае рэкамендацыі адпускнікам у выбары карыснай і спазнаваўчай формы правядзення адпачынку. У жніўні ладзіўся кірмаш "Трэці Спас – хлеба прыпас", на якім адбылася прэзентацыя, дэгустацыя і выстаўка-продаж новых гатункаў хлеба-булачных вырабаў.

Сярод бібліятэк, што размешчаны ў сельскай мясцовасці, адзначаная *Ізбіноўская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры "Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік" Мінскай вобласці* за прапаганду кнігі і чытання з дапамогай мультымедыйных тэхналогіяў, прадастаўленне доступу да мультымедыйных рэсурсаў. Бібліятэка працуе па чатырох праектах. Так, праект "Мультымедыйная дзейнасць бібліятэкі сяла" (2012 – 2015 гг.) прадугледжвае стварэнне і выкарыстанне мультымедыйных прадуктаў для розных узроставых катэгорый чытачоў, якія адлюстроўваюць гістарычнае мінулае горада, раёна, краіны і нашу сучаснасць, выклікаюць цікавасць да беларускай кнігі. У рамках праекта "Нефармальнае краязнаўства: мультымедыйная дзейнасць бібліятэкі сяла" (2012 – 2015 гг.) створаны і выкарыстоўваецца бібліятэкарамі цыкл электронных віктарын для дзяцей і дарослых, заснаваных на матэрыялах гісторыі Вілейшчыны. Згодна праекта "Інтэлектуальны квэст для дзяцей у бібліятэцы" (2014 – 2017 гг.) распрацаваны і штогод праводзяцца, сумесна з калектывам раённага Дома рамёстваў, інтэлектуальныя квэсты для дзяцей і падлеткаў. Праект "Беларуская бібліятэка" (2012 – 2016 гг.) прадугледжвае правядзенне мерапрыемстваў і выставаў, выпуск юбілейных буклетаў і плакатаў, памятак-закладак, прысвечаных беларускай кнізе і яе стваральнікам, складанне аўдыётэкі на аснове твораў славутых беларускіх пісьменнікаў.

Дыплом трэцяй ступені ў намінацыі "За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы" атрымала *Бялыніцкая цэнтральная раённая бібліятэка дзяржаўнай установы культуры "Бялыніцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сетка" Магілёўскай вобласці*. Прыярытэтнымі напрамкамі працы бібліятэкі з'яўляюцца краязнаўства і патрыятычнае выхаванне. Так, бібліятэкарамі

створаныя чатыры электронныя паўнатэкставыя базы дадзеных краязнаўчага і ваенна-патрыятычнага характару, доступ да якіх арганізаваны на сайце бібліятэкі: "Радзімая прыдруцкая зямля, часцінка нашай любай Беларусі", "Их именами названы улицы Белынич", "Літаратурная карта Бялыніцкага раёна", "Электронная кніга памяці Бялыніцкага раёна". У рамках творчага праекту "Память войны стучит нам в сердца" зроблена дзіцячая рукапісная кніга памяці аб Вялікай Айчыннай вайне "Войны мы не видели, но знаем…". Гэта апавяданні-сачыненні чытачоў-дзяцей аб сваіх прадзедушках, прабабушках, ветэранах-земляках, малюнкі рабят ваеннай тэматыкі.

На трэцюю прэмію сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у намінацыі "За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы" журы вылучыла *Барсееўскую сельскую бібліятэку-філіял № 3 дзяржаўнай установы культуры "Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" Віцебскай вобласці* за рэалізацыю праекта "Будуем казачны музей пад адкрытым небам". Гэты праект накіраваны на прыцягненне чытачоў у бібліятэку, занятасць дзяцей летам і арганізацыю іх вольнага часу, развіццё творчага ўяўлення і эстэтычнага ўспрымання. Музей размешчаны на тэрыторыі, прылеглай да бібліятэкі. Казачныя персанажы музея выраблены з розных матэрыялаў, якія ў паўсядзённым жыцці ўжо не знаходзяць прымянення: пластыкавыя бутэлькі, шыны, драўляныя адкіды, тканіны і г.д. На тэрыторыі музея ёсць і "Літаратурная альтанка", дзе размясцілася чытальная зала. Тут бібліятэкар праводзіць з дзецьмі віктарыны, конкурсы малюнкаў, арганізоўвае выставы кніг і абмеркаванне навінак літаратуры.




**У намінацыі "За падтрымку і развіццё чытання"** першае месца прысуджанае *дзяржаўнай установе культуры "Навагрудская раённая бібліятэка" Гродзенскай вобласці* за прыцягненне ў сцены бібліятэкі моладзі, развіццё цікавасці да чытання праз выкарыстанне нестандартных формаў папулярызацыі кнігі. Бібліятэка разам з Навагрудскім гандлёва-эканамічным каледжам з 2012 г. ажыццяўляе сумесны праект "Чытанне – шлях да дасканаласці", які шырока рэкламуе беларускую і сусветную літаратуру. Найбольш папулярныя бібліятэчныя мерапрыемствы праекта – літаратурныя подыумы і кніжныя дэфіле, адметнасць якіх скрыта ў незвычайнасці прадастаўлення кніг, а для самой моладзі – у імправізацыі і магчымасці пераўвасаблення. У рамках праведзенай бібліятэкай раённай акцыі "Моладзь ЗА кнігу і чытанне", скіраванай на распаўсюджванне кнігі і чытання сярод жыхароў Навагрудчыны, павышэнне прэстыжу чытання, прайшло пяцьдзесят шэсць мерапрыемстваў: флэш-мобы, бібліядэсанты, PR-акцыі, чэмпіянаты маладых сем'яў. Апрабаваная новая форма працы – маладзёжны валанцёрскі рух па арганізацыі дастаўкі бібліятэчных кніг чытачам, якія маюць у гэтым патрэбу.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у азначанай намінацыі першае месца заняла *Каменская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры "Чавуская бібліятэчная*

*сетка” Магілёўскай вобласці,* вялікую ўвагу якая надае папулярызацыі кнігі і чытання. Бібліятэкай рэалізуецца мэтавая праграма “Читающая деревня”, накіраваная на актывізацыю цікавасці да кнігі насельніцтва вёскі, каб стымуляваць дзяцей не проста чытаць, а вучыцца аналізаваць прачытанае, фармаваць сваё меркаванне аб прачытаным, бібліятэка рэалізуе цікавы праект “Экран прочитанных книг”. Прыярытэтным напрамкам у дзейнасці бібліятэкі з’яўляецца і ваенна-патрыятычнае выхаванне. У памяць аб тых далёкіх гадах, аб гераічных і трагічных падзеях, легендарных людзях нашай зямлі супрацоўнікамі бібліятэкі рэалізаваныя праекты: “Память: воинские захоронения” (2014), “Жывая памяць” (2015), мэта якіх – выхаванне ў маладога пакалення патрыятычных пачуццяў, фарміраванне свядомасці грамадзяніна-патрыёта на аснове гістарычных каштоўнасцяў, звычаяў і традыцый. Пры бібліятэцы дзейнічае падлеткавы клуб “Патрыёт”, члены якога штогод прымаюць удзел у акцыях па добраўпарадкаванні домаўладанняў ветэранаў і дзяцей вайны, помнікаў і воінскіх пахаванняў, азеляненні цэнтра вёскі.

Дыпломам другой ступені ў намінацыі “За падтрымку і развіццё чытання” журы адзначыла *Клімавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя І.Я. Пехцерава дзяржаўнай установы культуры “Клімавіцкая бібліятэчная сетка” Магілёўскай вобласці*. Бібліятэка актыўна ажыццяўляе дзейнасць па патрыятычным выхаванні маладога пакалення, захаванні і папулярызацыі гістарычнай, літаратурнай, дакументальнай спадчыны Вялікай Айчыннай вайны. У 2014 г. стартаваў праект “Дакраніся да подзвігу сэрцам”, прысвечаны 70-годдзю вызвалення Беларусі ад немецка-фашысцкіх захопнікаў. У рамках праекта ажыццяўляўся пошук інфармацыі пра ваенныя дзеянні на тэрыторыі Клімаўшчыны, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, воінаў-клімаўчан, якія загінулі ў гады вайны; праводзіліся разнастайныя мерапрыемствы з удзелам ветэранаў і інвалідаў вайны, працаўнікоў тылу, вязняў канцлагераў. Вынікам пошукава-даследчай дзейнасці бібліятэкі стала стварэнне гісторыка-краязнаўчай базы даных “Прикоснись к подвигу сердцем”, якая размешчана на сайце бібліятэкі.

Сярод бібліятэк, што знаходзяцца ў сельскай мясцовасці, на другое месца ў гэтай намінацыі вылучаны *філіял “Бастунская інтэграваная сельская бібліятэка” дзяржаўнай установы культуры “Воранаўская раённая бібліятэка” Гродзенскай вобласці.* Далучэнне да нацыянальных каранёў, традыцыяў і духоўных каштоўнасцяў; выхаванне духоўна-маральных якасцяў, прававой, экалагічнай культуры, фармаванне асноваў здаровага ладу жыцця; стварэнне ўмоваў для змястоўнага інтэлектуальнага вольнага часу – гэта прыярытэтныя накірункі працы бібліятэкі з дзецьмі і падлеткамі. У рамках мэтавай праграмы “Быць здаровым – гэта здорава” знаходзяць сваё асвятленне як агульныя праблемы захавання здароўя, так і праблемы алкагалізму, наркаманіі ды іншых шкодных звычак маладога пакалення. Па папулярызацыі здаровага ладу жыцця пры бібліятэцы дзейнічае аматарскае аб’яднанне “Знахарка”. Для выхаванцаў дзіцячага сада бібліятэкар арганізуе “Летнія чытанні ў пясочніцы”. Запамінальныя для юных чытачоў – творчыя сустрэчы з паэтамі-землякамі.

Дыплом трэцяй ступені ў намінацыі “За падтрымку і развіццё чытання” атрымала *Камянецкая раённая дзіцячая бібліятэка дзяржаўнай установы культуры “Камянецкая раённая бібліятэчная сістэма” Брэсцкай вобласці* за рознабаковую станоўчую працу з маладым пакаленнем у межах праекта “Читающие дети – счастливая семья” (2014 – 2016 гг.). Праект накіраваны на прыцягненне ў бібліятэку дзяцей і бацькоў, іх сумесную творчасць, падтрымку цікавасці да кнігі, захаванне традыцыяў сямейнага чытання. У рамках праекта ў бібліятэцы створаная камфортная інфармацыйная прастора для дзяцей і бацькоў, якая прадстаўлена Цэнтрам падтрымкі і развіцця чытання “Планета – семья”. У 2015 г. бібліятэка праводзіла цікавае свята “Бібліяпрыцемкі-2015”, прысвечанае Беларусі,

жыццю, традыцыям і абрадам нашых продкаў. У рамках правядзення мерапрыемства быў створаны міні-музей “Беларуская хатка”, праведзеныя конкурс і дэгустацыя беларускіх страваў “Смачна есці!”, мастар-клас “Прыгожае сваімі рукамі”, адбылося тэатралізаванае прадстаўленне “Чароўнае рэшата”.




Вынікі конкурсу сведчаць аб невычэрпным патэнцыяле працы бібліятэк па фармаванні нацыянальнай свядомасці насельніцтва, распаўсюджванні ідэі беларускасці, прапаганды нацыянальнай спадчыны, гісторыі, літаратуры, мовы, народнай культуры. І сёння можна з упэўненасцю сказаць, што конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры” будзе працягвацца і пашырацца, спрыяць больш якаснай працы бібліятэк, стымуляваць іх да рэалізацыі новых задумак і планаў, пошуку інавацыйных і цікавых сваім чытачам формаў дзейнасці.

***Вольга КАКШЫНСКАЯ**, галоўны бібліятэкар навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*